# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** Ода. Луска. Лье. Астра. Груша. Апад. Кавун. Грыб. Салавей. Блік. Указ. Ікс. Заклад. Асвета. Орша. Сарока. Бура. **Па вертыкалі:** Натарыус. Болт. Зала. Алег. Уступ. Парад. Рыкша. Ранг. Шаты. Двое. Ралі. Бокс. Агу. Ваза. Ікра. Клівер. Аванс. Зара. Краб. Дача. Ток.

**Склаў**
**Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.43 | 21.33 | 16.50 |
| Віцебск — | 4.24 | 21.31 | 17.07 |
| Магілёў — | 4.33 | 21.24 | 16.51 |
| Гомель — | 4.38 | 21.11 | 16.33 |
| Гродна — | 5.00 | 21.47 | 16.47 |
| Брэст — | 5.09 | 21.39 | 16.30 |

## Месяц

*Першая квадра 1 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

*Пр.* ТРОЙЦКІЯ ДЗЯДЫ, *Алены, Канстанціна, Касьяна, Міхаіла, Фёдара.* **К.** *Клацільды, Тамары, Анатоля, Караля, Мацея.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## ■ Запрашальнік

### У сталіцы пройдзе фестываль «Мінскі вернісаж»

**1—3 чэрвеня ў Мінску праходзіць міжнародны фестываль прыгажосці па цырульніцкім майстэрстве, дэкаратыўнай касметыцы і нэйл-дызайне «Мінскі вернісаж». Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць Ліга творчай моладзі, упраўленне бытавога і гасцінічнага абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама.**

У рамках фестывалю пройдзе прафесійны конкурс сярод цырульнікаў, візажыстаў, майстроў ногцевага сэрвісу, а таксама выстаўка парфумерна-касметычнай прадукцыі, інструменту, прылад, абсталявання і аксесуараў для салонаў прыгажосці. Зарэгістравана 537 намінантаў у 29 намінацыях. Сфармавана 17 каманд ад дзяржаўных і камерцыйных устаноў адукацыі і студый па падрыхтоўцы цырульнікаў, візажыстаў і майстроў ногцевага сэрвісу. Зарэгістравана таксама 7 каманд з Расіі, Украіны, Латвіі і Эстоніі.

Для ўручэння пераможцам і прызёрам падрыхтавана 457 узнагарод, 100 аўтарскіх мастацкіх дыпломаў ручной работы, прызы ад партнёраў фестывалю.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Даты | Падзеі | Людзі

### 3 ЧЭРВЕНЯ

**1797** год — нарадзіўся (г. Дуброўна) Аляксандр Міхайлавіч Казарскі, ваенны дзеяч. З 1811 года — на флоце. Служыў у Дунайскай ваеннай флатыліі, на Чарнаморскім флоце. У руска-турэцкай вайне 1828—1829 гадоў вызначыўся пры ўзяцці крэпасцяў Анапа і Варна. Як камандзір брыга «Меркурый» паспяхова кіраваў няроўным боем супраць двух турэцкіх лінкораў, прымусіўшы іх адступіць. За мужнасць узнагароджаны ордэнам святога Георгія 4-й ступені, брыг атрымаў Георгіеўскі сцяг. Подзвігу экіпажа «Меркурыя» прысвечаны карціны І. Айвазоўскага: «Брыг Меркурый» пасля перамогі над двума турэцкімі суднамі сустракаецца з рускай эскадрай» і «Брыг Меркурый», атакаваны двума турэцкімі караблямі». Памёр у 1833 г. У Севастопалі пастаўлены помнік з надпісам «Казарскаму. Нашчадкам у прыклад». Яго імя ў расійскім флоце было прысвоена шэрагу караблёў.

**1885** год — дата нараджэння Якава Міхайлавіча Свярдлова, савецкага дзяржаўнага і партыйнага дзеяча, старшыні УЦВК. У 1905 годзе ўзначаліў камітэт РСДРП у Екацярынбургу, у 1906-м — член Уральскага камітэта. Як упаўнаважаны ЦК РСДРП працаваў у Пецярбургскай партыйнай арганізацыі, удзельнічаў у падрыхтоўцы выдання газеты «Звязда», у падрыхтоўцы І кангрэса Камінтэрна. Прымаў удзел у стварэнні БССР. Памёр у 1919 годзе. Яго імем названы вуліцы ў многіх гарадах Беларусі.

**1843** год — нарадзіўся Клімент Аркадзевіч Ціміразеў, рускі вучоны ў галіне батанікі і фізіялогіі раслін, тэарэтык дарвінізму, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1890 г.), Расійскай АН (1917 год). Раскрыў заканамернасці фатасінтэзу як працэсу выкарыстання святла для ўтварэння арганічных рэчываў у расліне. Аўтар навуковых прац па метадах даследавання фізіялогіі раслін, біялагічных асновах аграноміі, гісторыі навукі.

**1912** год — Янка Купала скончыў работу над камедыяй «Паўлінка», першым сваім драматычным творам.

**1935** год — нарадзіўся (в. Мачулішча Крупскага раёна) Васіль Зуёнак, беларускі паэт, празаік, крытык, літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук. Працаваў у газеце «Піянер Беларусі», намеснікам, затым — галоўным рэдактарам часопіса «Маладосць», галоўным рэдактарам часопіса «Бярозка». Аўтар зборнікаў лірычнай паэзіі «Крэсіва», «Крутаяр», «Сяліба», «Лета трывожных даждэжоў» і іншых, кніг для дзяцей, нарысаў і замалёвак. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі.



### Было сказана

**Нэлі ТУЛУПАВА, паэтэса:**
*«Нам не дадзена двойчы жыць,*
*Але дадзена нам неўміручасць».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Падмануты муж жорстка адпомсціў палюбоўніку жонкі: цяпер у шафе немагчыма злавіць вай-фай!**

— Роза, хочаце пайсці са мной у музей?
— Фіма, вы што, слова «рэстаран» не вымаўляеце?

**Жанчынам на заметку.**
**Калі ўвечары ты прыдумала, што надзець, значыць, раніцай можна на паўгадзіны даўжэй паспаць.**

— Таксі выклікалі?
— Так.
— Разумееце, у мяне машына зламалася, давайце я вас пешшу дадому правяду?

**Калі мужчына прапануе табе сесці і пераглядзець усю Санта-Барбару — гэта значыць, што ён хоча застацца з табой на ўсё жыццё.**

— Ну вядома гэта Гучы! Мерайце! Станавіцеся на кардонку, а я пакуль шторку патрымаю!




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2112.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 2 чэрвеня 2017 года.